■ Успаміны дзяцінства

# ПРА ЛЕС-КАРМІЛЕЦ

Угрыбы ў сям'і Дарынкі любяць хадзіць усе. У кожнага ў лесе ёсць свае грыбовішчы. Больш за ўсіх іх у маці. Кожны ранак, яшчэ «да кароў» (іх некалькі статкаў, і яны пазбіваюць шляпкі, патрушчаць грыбы на карані сваімі капытамі), яна абабягае з каробкай за плячыма найбліжэйшыя.

— Шурка, возьмеш Дарку і набярэш падасінавікаў на булён, — яшчэ з вечара нагадвае меншаму з сыноў яна. Удакладняць, дзе набраць тых чырвонагаловых асавікоў, нікому, нават Дарынцы, няма патрэбы, — яны растуць за агародам у маладым асінніку. Назаўтра брат расштурхвае яе і цягне за сабой у той асіннік. Трэба паспяшаць, бо іх апярэдзяць суседкі. Шурка — майстар знаходзіць самыя маленькія чырвонагаловікі. Падразае не ўсе, а тут жа хавае-прыкрывае іх голькамі, травой — каб яны падраслі і іх не знайшлі да часу іншыя грыбнікі.

Потым ад тых чырвонагаловікаў лыжка ў талерках стаўма стаіць. Але ўсім падабаецца хрумстаць сакавітыя грыбы ў саладкаватым ад іх булёне.

Бацька са старэйшымі братамі бягуць у грыбы далёка — на Асінаўку і ў Будзішча.

Дарынка запомніла першыя настаўленні маці яшчэ па дарозе да лесу. Самы лепшы час для збору грыбоў — досвета. Гэта значыць ранараненька. У расе каптурыкі грыбоў блішчаць, і яны добра відаць (як і падчас дажджу). І наадварот — белым днём і пад сонцам іх можна і не заўважыць зусім. Да дрэў пажадана падыходзіць з таго боку, дзе на іх расце мох, — паўночнага: там больш грыбоў, бо яны любяць цень. Па лесе трэба ісці так, каб сонца знаходзілася за спіной. Калі пойдзеш процi нябеснага свяціла, дык яно цябе будзе сляпіць, а ў вачах будзе рабізна-разнаколер, якая маскіруе грыбы. У сырым лесе трэба кружыць далей ад дрэў, таму што грыбы «выбягаюць» на светлыя сонечныя палянкі — на іх цяплей, чым пад кронай дрэў. І наадварот трэба сябе паводзіць пасля летняга сухавею: калі грыб цiснецца да камля дрэва, хаваецца ў цень ад надта надакучлівага сонца. А яшчэ маці вельмі строга наказала не збіваць грыбы нагамі, не вырываць іх з карэннем (а падразаць сцізорыкам), не галёкаць здуру (не крычаць і не спяваць), не ламаць галінкі маладых дрэўцаў і кустоў, бо ім баліць.

Грыбы нарыхтоўваюцца сям'ёй у розным выглядзе. Па-першае, яны дзеляцца пры перабіранні і першай сухой ачыстцы па сартах: першымі ідуць рудагаловыя баравікі, за імі — асавікі і падбярозавікі, а потым ужо сыраежкі і лісічкі.

Баравікі зноў-такі дзеляцца на «сушку» і «марыноўку». Сярэднія і маленькія баравічкі мыюцца ў некалькіх водах і адпраўляюцца варыцца, а потым запраўляюцца марынадам са спецыямі і раскладваюцца ў шкляныя слоікі, якія бацечка Дарынкі закручвае спецыяльнай машынкай. Самыя вялікія з іх укладваюцца на металічныя бляхі, засцеленыя саломай, і ставяцца ў цёплую пасля ранішняга выпальвання печ. Потым яны «даходзяць» на яе чэрані і ўжо потым вечарамі бацька садзіцца за іх нізанне. Нізкі татачка адмярае сантыметрам, якім карыстаецца пры шыцці мама, каб яны былі аднаго памеру. Адна за адной баравіковыя гірлянды вешаюцца на гладкі кіёк-перакладзіну за печчу. Калі іх набіраецца да дзясятка, бацька прыхоплівае іх з сабой у абласны цэнтр, на базар. Разам з ім едзе і маці. Там бацькі здаюць свае духмяныя нізкі знаёмаму яўрэю-скупшчыку. Пасля грыбных паездак бацькі чаго толькі не прывозяць ім — сваім дзецям, з Гомеля: цукеркі, нізкі абаранкаў, абноўкі з адзежы і абутку.

У грыбныя гады сыраежкі бяруцца толькі для будзённага смажання на свіным тлушчы з цыбуляй і прыправамі. А вось лісічкі ідуць не толькі для смажання, але і для здачы нарыхтоўшчыкам.

БЕЗ чарніц у сям'і Дарынкі таксама не абыходзіцца ні адзін год. Гэтыя ягады ў хаце ў вялікай пашане. Яны нарыхтоўваюцца ў розным выглядзе: варэння, сушэння, настойкі. А яшчэ — галінак з ягадамі. Дарынка добра ведае, што яны першыя лекі, калі забалеў жывот.


kirdiy.com

У некаторыя з гадоў чарніц у навакольных лясах нібы камароў.

— Чым больш у лесе камароў, тым больш чарніц на чарнічніку, — кажа баба Ганна, а за ёй паўтарае потым маці Дарынкі.

Гэта чыстая праўда, бо тыя камары сляпіцай лезуць у рот, нос, вушы. Каб неяк уратавацца ад іх Дарынка і яе браты абвязваюць галовы хусткамі.

Хутчэй за ўсіх ягады бярэ Мацвей. Здаецца, яны толькі нагнуліся да ягадніка, толькі ўкінулі ў рот першыя чорныя пацеркі, а ён ужо крычыць, што набраў назбірач — літровы шкляны слоік, які нясе да вядра высыпаць. За ім стараецца Шурка. Хлопцы бяруць дзвюма рукамі. Дарынка таксама стараецца, але спачатку ў яе нічога не выходзіць: ягады то застаюцца пажмаканымі на кусточках, то падаюць. Лепей, чым у назбірач, чарніцы пападаюць у рот. Хутка ў Дарынкі з-пад хусткі блішчаць адны вочы.

— Паглядзі, як трэба шморгаць, мурзілка, — кажа малодшы з братоў і, нарагатаўшыся з яе выгляду, паказвае. — Бачыла, як маці або я доім карову? Спачатку адной рукой — шморг-цырк, потым другой рукой — шморг-цырк. Так і ягады. Запомні — не адначасова! Пакажы сама, як ты зразумела, — стаіць, крукам нагнуўшыся, побач з ёй брат.

Дарынка спрабуе, і ў яе, здаецца, атрымліваецца. Праўда, не так хутка, як хочацца, але галоўнае, яна зразумела тэхніку збірання. Пакуль яна вучыцца, браты напаўняюць вядро, а яна ўсяго паўлітровы слоік. Але гэта яе першая поўная пасудзіна, і яна не дае яе высыпаць да агульнай кучы. Хоча пахваліцца бацькам сваім поспехам. Браты адступаюць і просяць яе адвязаць той слоік і паставіць побач з поўным вядром (бо спатыкнецца яшчэ на якое ламачча ды рассыпле).

У іх яшчэ з сабой пусты плецены з дзвюма ручкамі кошык. Каб яго напоўніць чорнымі ягадамі-пацеркамі, трэба абавязкова падсілкавацца. Яны садзяцца ў кружок, і Мацвей дастае з кошыка торбу з правізіяй. Кожны раз, адпраўляючы іх у лес, маці складвае ім ежу і прыгаворвае пры гэтым: «Гэта не вы яду носіце, а яна вас».

Чорны хлеб з чыгуначнага магазіна, прывезены з Гомеля, перакладзены скрылікамі сала, у лесе такі смачны!.. Потым у ход ідуць скібкі белага хлеба або батонаў, намазаных свежым чарнічным варэннем. У сезон іх маці варыць яго ці не штодня ў вялізнай алюмініевай місцы на двары на спецыяльным вогнішчы. Скібкі яны запіваюць па чарзе малаком з бутэлькі.

Перакусіўшы і трохі паляжаўшы на скінутых на мох верхніх адзежынах, яны падымаюцца і зноў бяруцца за ягады.

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# УСЕ МАЛІЛІСЯ ЗА ІХ...



**Хачу падзяліцца з чытачамі «Звязды» вось гэтым надзвычай пранікнёным здымкам, які ўжо шмат гадоў захоўваю ў сваім сямейным альбоме. На ім Казімір (родны брат Фелікса Дзяржынскага) і яго жонка Люцыя. Падчас вайны гэтыя слаўныя людзі былі ў Івянецкім падполлі і выратавалі некалькі дзясяткаў жыццяў.**

Казімір нарадзіўся ў маёнтку Азямблова (цяпер Дзяржынава) у беларускай шляхецкай сям'і Дзяржынскіх герба Суліма. Люцыя (у дзявоцтве — Сціацi) — у Аўстрыі, у горадзе Карлсруэ. Менавіта там і сустрэлася яна з Казімірам, які вучыўся ў Вышэйшым політэхнічным інстытуце і кватараваў у іх доме.

З 1935 года Казімір і Люцыя перабраліся ў Азямблова. Люцыя дзякавала Богу, што муж прывёз яе на нашу зямлю. Яна палюбіла цудоўную прыроду, мілагучную мову тутэйшых людзей, іх працавітасць і годнасць. Выключна выхаваная і адукаваная асоба, яна вельмі хутка набыла аўтарытэт сярод мясцовых сялян, шляхты і інтэлігенцыі. Яе музычным талентам захапляліся Марыя Асіповіч, Наталля Арсеньева, Уладзіслаў Аскерка, Бенядзікт Тышкевіч і іншыя госці фальварка.

Неўзабаве пачалася Другая сусветная вайна. Дзяржынскія пераехалі ў мой родны Івянец. Пасля прыходу немцаў Казімір уладкаваўся на працу ў гандлёвае таварыства, а Люцыя — перакладчыцай у нямецкую камендатуру.

Будучы перакананымі антыфашыстамі, Дзяржынскія актыўна ўключыліся ў барацьбу супраць акупантаў. Яны мелі доступ да сакрэтных звестак пра нямецкія войскі, планы карных экспедыцый ды вывазу моладзі ў Нямеччыну. Гэту інфармацыю накіроўвалі праз надзейных людзей партызанам. Дзякуючы Дзяржынскім апошнія паспяхова выходзілі з акружэнняў і наносілі адчувальныя матэрыяльныя страты праціўніку.

Асабліва жорсткую аперацыю пад кодавай назвай «Герман» карнікі праводзілі летам 1943 года. Дзяржынскія вельмі дапамаглі партызанам у падрыхтоўцы і ажыццяўленні ее зрыву. Спачатку даслалі ім звесткі пра стан гарнізона, а непасрэдна перад самой аперацыяй схавалі ў сябе цэлы партызанскі атрад. Яны выдатна ўсведамлялі, чым для іх гэта можа скончыцца. І нягледзячы ні на што рабілі сваю патрыятычную справу.

Праз некаторы час карны атрад прыбыў у Івянец і пачаў зганяць людзей у драўляную царкву, якая знаходзілася на плошчы. Затым абклалі яе саломай і сабраліся падпальваць. Люцыя Вільгельмаўна смела выступіла наперад і заявіла камандзіру карнікаў, што людзі, сабраныя ў царкве, не вінаватыя, што ўсе партызаны адышлі ў лес. Толькі дзякуючы гэтаму івянчан адпусцілі.

Неўзабаве ворагі пачалі блакаду Налібоцкай пушчы. Дзяржынския, як заўсёды, перадавалі звесткі партызанам пра стан нямецкіх войскаў. Але знайшоўся здраднік, які выдаў іх немцам. Следчы з гестапа прывёў настолькі пераканаўчыя факты іх падпольнай дзейнасці, што ім не заставалася сэнсу адпірацца і даказваць сваю невінаватасць. Мясцовае падполле разам з нямецкімі антыфашыстамі зрабілі спробу вызваліць іх з турмы. Але Казімір катэгарычна адмовіўся ад спакуслівай выратавальнай прапановы з-за боязі, што загінуць людзі. Люцыя пагадзілася з ім.

24 ліпеня 1943 года чорны лімузін павёз Дзяржынскіх у апошні шлях. Усе маліліся за іх, за людзей, якія рабілі дабро па покліча сэрца і душы. Казіміра і Люцыю расстралялі за каталіцкімі могілкамі, у лесе. Праз некаторы час івянчане ўпотай перазахавалі іх на могілках. І да гэтага часу на іх магіле на Дзень усіх святых запальваюцца памінальныя свечкі.

**Ігар СОЛТАН.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■